# Альманскія балоты – агульны клопат: у рамках І Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя пытанням аховы прыроды

**Мінітэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі і Міністэрства экалогіі і прыродных рэсурсаў Украіны ў 2017 годзе прынялі сумеснае рашэнне аб стварэнні пастаянна дзейнай двухбаковай камісіі па каардынацыі пытанняў аховы і ўстойлівага выкарыстання трансгранічных прыродных тэрыторый. Першае пасяджэнне гэтай камісіі прайшло 25—26 кастрычніка ў Гомелі.**

Адна з тэм, якую абмяркоўвалі спецыялісты, — становішча на Альманскіх балотах. Гэта сакральны аб’ект прыродна-запаведнага фонду краіны. Балоты захаваліся практычна ў першапачатковым выглядзе.

«Тут доўгія гады існаваў па-сапраўднаму запаведны рэжым, пачынаючы з часоў, калі гэта тэрыторыя належала магнацкаму роду Радзівілаў. Яны вельмі строга забаранялі ўсякую гаспадарчую дзейнасць і толькі зрэдку ладзілі вялікакняжацкія паляванні, — увёў у курс справы **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Дзмітрый ГРУМО.** — У пасляваенныя гадь беларускімі навукоўцамі былі сабраны ўсе неабходныя матэрыялы для абвяшчэння Альманскіх балот запаведнай тэрыторыяй. Аднак замест запаведніка тут быў арганізаваны найбуйнейшы ў Еўропе і другі па велічыні ў свеце Мерлінскі ваенны авіяцыйны палігон. Толью ў 1998 годзе на гэтай тэрыторыі быў створаны рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Альманскія балоты».

Між тым, паводле слоў вучонага, размяшчэнне палігона нават спрыяла захаванню балот у першапачатковым выглядзе. Цяпер жа існуе шэраг праблем: лясныя і тарфяныя пажары; суцэльныя высечкі; асушальная меліярацыя; рэкрэацыйныя нагрузкі, у тым ліку ўтылітарная рэкрэацыя, фактар неспакою. Больш за ўсё пажараў фіксуецца ў верасні, калі на балотах актыўна збіраюць журавіны. Прычым спрошчаны доступ на беларускую тэрыторыю дазволены і грамадзянам Украіны. Па ягады з суседняй краіны за дзень прыходзяць ад 1000 да 1500 чалавек.

Таксама білі заслуханы выступленні на гэтую тэму Міхаіла Максіменкава — навуковага супрацоўніка НПЦ на Біярэсурсах НАН Беларусі, і Васіла Бачука — дырэктара Ровенскага прыроднага запаведніка.

Па выніках пасяджэння было прынята рашэнне аб распрацоўцы і далейшай рэалізацыі сумеснага плана кіравання трансгранічным водна-балотным угоддзем міжнароднага значэння «Альманскія балоты — Перабароды».

Члены камісіі з абодвух бакоў актыўна удзельнічалі ў дыскусіях, часам нават спрачаліся, але сустаршыні — **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Аляксандр Корбут і намеснік міністра экалогіі і прыродных рэсурсаў Украіны Васіль ПАЛУЙКА** — знаходзілі кансэнсус па вострых пытаннях.

«Безумоўна, рабоце пасяджэння папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа з абодвух бакоў, — сказаў Васіль Палуйка. — Мы адкрыта гаварылі аб праблемах, каму што баціль — гэта важна. Задаволены, што пасяджэнне прайшло ў канструктыўнай рабочай абстаноўцы. Члены камісіі вельмі адказна падыходзілі да прыняцяя выніковых рашэнняў, якія маюць канкрэтны практычны характар».

Аксана ЯНОЎСКАЯ

**Источник:** Звязда. – 2018. – 30 кастрычніка (№ 209). – С. 7.